# Асаблівасці вучэбнага дапаможніка «Беларуская мова» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання

**Антановіч Наталля Міхайлаўна,**
дацэнт кафедры
беларускага і рускага мовазнаўства
факультэта пачатковай адукацыі
Беларускага дзяржаўнага педагагічнага
ўніверсітэта імя Максіма Танка,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Антонава Надзея Уладзіславаўна,**
начальнік аддзела
метадычнага забеспячэння
пачатковай адукацыі
Нацыянальнага інстытута адукацыі,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт




У 2022/2023 навучальным годзе навучанне беларускай мове ў II класе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання будзе адбывацца па вучэбным дапаможніку «Беларуская мова» ў 2 ч. аўтараў Н. М. Антановіч, Н. У. Антонавай (Мінск: НІА, 2022), распрацаваным на падставе вынікаў конкурсу.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам змест вучэбнага дапаможніка грунтуецца на сістэмна-дзейнасным, культуралагічным, асобасна-арыентаваным, кампетэнтнасным падыходах і накіраваны на забеспячэнне асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў навучання беларускай мове. Праз матэрыял дапаможніка вучні II класа атрымліваюць пачатковыя ўяўленні пра мову як культурную каштоўнасць і сродак камунікацыі ў сацыяльным асяроддзі; спасцігаюць значнасць беларускай мовы як дзяржаўнай; авалодваюць графічнымі і каліграфічнымі навыкамі (у змесце дапаможніка прадугледжаны заданні на спісванне з рукапіснага і друкаванага шрыфтоў); атрымліваюць моўныя звесткі на арфаэпічным, арфаграфічным, лексічным і граматычным узроўнях (праз вырашэнне вучэбных задач);

знаёмяцца з правіламі маўленчага этыкету і замацоўваюць іх у пэўных жыццёвых сітуацыях.

Змест вучэбнага дапаможніка адпавядае вучэбнай праграме па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання (2017). Матэрыял у ім сістэматызаваны па раздзелах «Родная мова», «Гукі і літары», «Тэкст», «Сказ», «Слова», «Паўтарэнне». У адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбнай праграмы змест дапаможніка накіраваны на *фарміраванне моўнай кампетэнцыі* вучняў, свядомае *засваенне ведаў* па кожным раздзеле, *авалоданне спосабамі пазнавальнай дзейнасці і фарміраванне ўменняў і навыкаў, якія спатрэбяцца ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці.* Адной з важных задач аўтары вучэбнага дапаможніка бачаць у забеспячэнні паступовага бесканфліктнага пераходу ад навучання грамаце да навучання беларускай мове. Матэрыял вучэбнага дапаможніка, які мае адметную структуру, дазваляе вырашыць увесь спектр вучэбна-метадычных задач.

Матэрыял кожнага ўрока распрацаваны і пададзены з улікам яго тыпу. Вывучэнне новай тэмы пачынаецца з праблемнай сітуацыі, у якой гаворыцца, як віртуальны персанаж (Чамучык) сутыкаецца з моўнымі з'явамі ў штодзённым жыцці і імкнецца вырашыць непаразуменні ці цяжкасці. Вучням адводзіцца роля памочнікаў, якія павінны ўсвядоміць праблему і прапанаваць выйсце з яе праз вывучэнне матэрыялу на занятках. Праца над праблемнай сітуацыяй адбываецца пад кіраўніцтвам настаўніка. Са зместу праблемнай сітуацыі вылучаецца праблемнае пытанне. Для настаўніка гэтае пытанне з'яўляецца арыенцірам для вызначэння адукацыйнай мэты ўрока, выступае стрыжнем усёй працы над вучэбным матэрыялам і вызначае змест пытанняў для падвядзення вынікаў урока.

✔ У адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбнай праграмы змест дапаможніка накіраваны на фарміраванне моўнай кампетэнцыі вучняў, свядомае засваенне ведаў па кожным раздзеле, авалоданне спосабамі пазнавальнай дзейнасці і фарміраванне ўменняў і навыкаў, якія спатрэбяцца ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці.

Кожная праблемная сітуацыя па сваім змесце падводзіць да разумення праблемы, аднак не дае поўнага яе вырашэння, чым матывуе вучняў да асэнсаванага выканання заданняў па тэме, пададзеных у вучэбным дапаможніку.

Пошук вучнямі адказу на праблемнае пытанне адбываецца пры выкананні практыкаванняў. Першае практыкаванне «падказвае», якім чынам можна вырашыць моўную задачу, што з'яўляецца прадметам вывучэння на занятках, набліжае навучэнцаў да асэнсавання моўнай з'явы ці заканамернасці, спрыяе свядомаму ўспрыманню правіла.

У правіле, прадстаўленым у рубрыцы «Трэба ведаць», даецца абагульненая фармулёўка моўнай з'явы і прыклады для яе асэнсавання. Наступныя практыкаванні пададзены ў парадку паслядоўнага фарміравання прадметнага ўмення, замацавання яго на ўзыходзячых узроўнях (рэпрадуктыўным і прадуктыўным). У выпадку, калі па вывучаемай моўнай з'яве патрабуецца пэўнае ўдакладненне ці маецца выключэнне з асноўнага правіла, даюцца звесткі ў рубрыцы «Важная інфармацыя». Для матываванага яе ўвядзення прапануецца практыкаванне, у працэсе выканання якога вучні сутыкаюцца з праблемай, калі правіла «не працуе». Гэта праблема вырашаецца з дапамогай інфармацыі рубрыкі. Матэрыял кожных заняткаў завяршаецца практыкаваннем, прызначаным для дамашняй работы.

Засваенню новага матэрыялу ў дапаможніку папярэднічае абмеркаванне праблемнай сітуацыі, у якую трапляе вобразны персанаж — Чамучык, і пошук адказу на праблемнае пытанне. Напрыклад:

> **Чамучык падпісваў віншавальную паштоўку сваёй бабулі:**
>
> 
> 
>
> Хлопчык расхваляваўся. Пажаданне здароўя не змяшчалася ў радок. Што рабіць?
>
> Як перанесці слова з аднаго радка на другі?

Такім чынам вучэбны матэрыял арыентуе вучняў на авалоданне пэўнымі ведамі і ўменнямі з мэтай прымянення іх для вырашэння рэальных практычных і жыццёвых задач.

Як ужо адзначалася вышэй, новая лінгвістычная інфармацыя (звесткі пра мову, маўленне) па тэме ўрока падаецца ў даступнай форме для другакласнікаў у рубрыках «Трэба ведаць», «Важная інфармацыя». Гэты матэрыял вучні таксама «адкрываюць» разам з Чамучыкам. Напрыклад:

> Словы пераносяцца з аднаго радка на другі па складах: *ба-бу-ля.*
>
> Некалькі зычных у сярэдзіне слова пры пераносе можна раздзяляць, а можна перанесці разам: *ся-стра, сяс-тра, сяст-ра, дзё-ннік, дзён-нік.*

> Пры пераносе НЕЛЬГА:
>
> - пакідаць на радку ці пераносіць на новы радок **склад з адной літары:** *ана-нас, зда-роўе;*
> - адрываць *й, ў, ь, апостраф (')* ад папярэдняй літары: *чай-ка, лаў-ка, ляль-ка, аб'-езд;*
>
> Й Ў Ь '
>
> - раздзяляць спалучэнні літар *дз, дж,* якія абазначаюць гукі [дз'], [дж]: *ты-дзень, дож-джык.*
>
> ДЗ ДЖ

Авалоданне ўменнямі (спосабамі пазнавальнай дзейнасці) адбываецца ў працэсе выканання разнастайных па змесце і ступені складанасці практыкаванняў. Упершыню ў вучэбным дапаможніку па беларускай мове прапануюцца *рознаўзроўневыя заданні на выбар* («пілоты» — «касманаўты»), што дазволіць, з аднаго боку, настаўніку рэалізаваць ***індывідуальны*** і ***дыферэнцыраваны падыходы*** на ўроку, а з другога — кожнаму вучню зрабіць самастойны выбар з улікам сваіх магчымасцей.

Напрыклад:

> **71.** Прачытайце.
>
> Запішыце словы, падзяляючы для пераносу. Якімі правіламі вы карысталіся? Якія словы нельга падзяліць для пераносу?
>
> **Альбом, сойка, каўнер, акунь, студзень, мядзведзь, шчаўе.**
>
> Размяркуйце словы па трох слупках згодна з правіламі пераносу, што пададзены ў рубрыцы вышэй. Запішыце іх, падзяляючы для пераносу. Якія словы можна пераносіць рознымі спосабамі?
>
> **Медальны, Радзіма, ураджай, падзея, гадзіннік, рыдлёўка, сонейка.**

У адпаведнасці з узроставымі асаблівасцямі навучэнцаў, якія імкнуцца дасягнуць найвышэйшых поспехаў, заданні «пілотаў» і «касманаўтаў» характарызуюцца ўзрастаннем ступені складанасці. Арганізацыя работы з матэрыялам гэтых практыкаванняў патрабуе ад настаўніка ўважлівага і ўзважанага захавання прынцыпу індывідуалізацыі навучання, уліку ступені падрыхтоўкі кожнага вучня класа. Заданні могуць размяркоўвацца паміж навучэнцамі настаўнікам або выконвацца па іх самастойным выбары. Аб'ём выканання заданняў таксама можа вар'іравацца: ад аднаго з заданняў ці яго часткі — да выканання ўсіх заданняў практыкавання.

У сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя ў вучняў магчымы памылкі інтэрферэнцыйнага характару. З улікам гэтага ў рубрыцы «Важная інфармацыя», а таксама ў некаторых практыкаваннях прадугледжана супастаўленне пэўных фактаў у беларускай і рускай мовах

з мэтай папярэджання памылак як у вусным, так і пісьмовым маўленні.

У вучэбным дапаможніку шмат ўвагі надаецца *фарміраванню арфаграфічных уменняў і навыкаў* вучняў. Пры распрацоўцы практыкаванняў і заданняў, адборы адпаведнага дыдактычнага матэрыялу аўтарамі ўлічваліся псіхалінгвістычныя асаблівасці фарміравання арфаграфічнага навыку ў малодшым школьным узросце.

Знаёмству з арфаграфічным правілам папярэднічае сутыкненне з рэальнай праблемнай сітуацыяй і пошук адказу на праблемнае пытанне. Свядомаму прымяненню арфаграфічных правіл садзейнічае *праца з алгарытмамі.* У сувязі з гэтым у вучэбным дапаможніку прапануюцца гатовыя алгарытмы (схемы), з апорай на якія навучэнцы засвойваюць паслядоўнасць дзеянняў для вызначэння правільнага напісання слоў або дапаўняюць іх патрэбнай інфармацыяй. Да гэтых алгарытмаў (апорных схем) вучні могуць звяртацца і пры выкананні іншых практыкаванняў. Падчас выкарыстання алгарытмаў адбываецца арганізацыя разумовай дзейнасці навучэнцаў, мабілізуюцца слых, зрокавая памяць.

Варта адзначыць, што ў вучэбным дапаможніку прадстаўлены *разнастайныя арфаграфічныя практыкаванні,* разлічаныя як на зрокавае, так слыхавое ўспрыманне: спісванне з дадатковымі заданнямі, навучальныя дыктанты (запіс пад дыктоўку настаўніка асобных слоў, сказаў, тэкстаў), пісьмо па памяці. Прапанаваныя алгарытмы спісвання, пісьма пад дыктоўку і па памяці (змешчаны на форзацы) дазваляюць настаўніку арганізаваць паслядоўную працу па іх засваенні другакласнікамі. Арфаграфічныя практыкаванні прадстаўлены не толькі на старонках, прысвечаных вывучэнню арфаграфічных правіл, — сістэматычная і сістэмная праца па выпрацоўцы арфаграфічных уменняў і навыкаў прадугледжана на працягу ўсяго перыяду вывучэння беларускай мовы ў II класе.

Асаблівая ўвага ў дапаможніку надаецца заданням, накіраваным на *развіццё арфаграфічнай пільнасці* — здольнасці вылучаць арфаграмы ў словах, вызначаць іх тыпы. Гэта заданні на знаходжанне, падкрэсліванне і тлумачэнне правапісу слоў на вядомыя правілы; групоўка слоў у залежнасці ад тыпу арфаграмы; падбор вучнямі слоў на тую ж арфаграму, што і ў прапанаваным слове; гука-літарны аналіз слоў і інш.

У адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбнай праграмы ў дапаможнік уключана праца па засваенні *правапісу слоўнікавых слоў,* якія прадстаўлены асобна або ў разнастайных па змесце практыкаваннях. У дапаможніку прадугледжана паўтарэнне раней вывучаных слоўнікавых слоў. У канцы першай і другой яго частак змешчаны спіс слоўнікавых слоў, пералічаных у парадку вывучэння для зручнасці іх паўтарэння ці выкарыстання ў якасці апоры. Мяркуецца, што ў другой частцы дапаможніка на форзацах будуць размешчаны зрокавыя апоры са слоўнікавымі словамі, што дазволіць навучэнцам устанаўліваць пэўныя асацыяцыі і запамінаць напісанне слова.

✔ Упершыню ў вучэбным дапаможніку па беларускай мове прапануюцца рознаўзроўневыя заданні на выбар («пілоты» — «касманаўты»), што дазволіць, з аднаго боку, настаўніку рэалізаваць індывідуальны і дыферэнцыраваны падыходы на ўроку, а з другога — кожнаму вучню зрабіць самастойны выбар з улікам сваіх магчымасцей.

Выкананне некаторых практыкаванняў накіравана на фарміраванне *лексікаграфічных уменняў* і прадугледжвае выкарыстанне арфаграфічнага і тлумачальнага слоўнікаў. Амаль што з першых урокаў вучні атрымліваюць уяўленне пра будову тлумачальнага слоўніка. Змешчаны ў канцы кожнай з частак вучэбнага дапаможніка невялікі «Тлумачальны слоўнік» дапамагае асэнсаваць значэнне найбольш складаных для разумення слоў, якія сустракаюцца на яго старонках і пазначаны зорачкай (*).

Асобую вучэбна-метадычную функцыю выконваюць форзацы вучэбнага дапаможніка. На іх змешчаны актуальны вучэбны матэрыял. Алфавіт пададзены з назвамі літар і рукапісным узорам; указаны асноўныя характарыстыкі гукаў беларускай мовы, якія абазначаюцца адпаведнымі літарамі. Гэта інфармацыя дапаможа вучням узнавіць веды і графічныя навыкі, атрыманыя ў I класе.

Адметны выгляд мае стужка літар. Кампаноўка літар на стужцы дазволіць навучэнцам адрозніваць літары галосных гукаў для абазначэння цвёрдасці і мяккасці зычных, дыферэнцыраваць літары зычных гукаў, якія абазначаюць парныя і няпарныя па цвёрдасці-мяккасці і звонкасці-глухасці зычныя гукі. Стужка літар спатрэбіцца вучням для гука-літарнага аналізу слоў, выканання заданняў на ўстаўку прапушчаных літар ці выбар літары для напісання, стане арыенцірам для асэнсавання некаторых правіл правапісу.

Абагуленыя правілы правапісу, заснаваныя на фанетычным прынцыпе, якія вучні засвойваюць у першай частцы вучэбнага дапаможніка: правапіс **о, э — а; е, ё — я;** правапіс **ў** (нескладовага), паказаны на форзацы ў выглядзе схем і могуць выкарыстоўвацца для паўтарэння і абагульнення вывучанага.

Для арганізацыі працы па засваенні і паўтарэнні правапісу слоўнікавых слоў, візуалізацыі іх напісання можна выкарыстаць зрокавыя апоры з малюнкамі, змешчаныя на форзацы. Выкарыстанне малюнкаў-апор як мнеманічнага прыёму пры засваенні слоўнікавых слоў дапаможа вучням устанаўліваць пэўныя асацыяцыі і запамінаць напісанне слова.

Асноўныя правілы, вывучаныя ў II класе, змешчаны на форзацы пад назвай «Мы ведаем!». Гэты матэрыял можна выкарыстоўваць з мэтай абагульнення і сістэматызацыі матэрыялу, а таксама для правядзення карэкцыйнай работы пасля кантролю ведаў у выглядзе работы над памылкамі.

У вучэбным дапаможніку рэалізуюцца палажэнні ***кампетэнтнаснага падыходу,*** які мае на мэце фарміраванне ў вучняў *метапрадметных (універсальных) уменняў* (пазнавальных, камунікатыўных і рэгулятыўных). Прадстаўлены заданні на авалоданне і развіццё лагічных дзеянняў аналізу, параўнання, сінтэзу, абагульнення, групоўкі; развіццё ўменняў працаваць з мадэлямі, схемамі і інш. У дапаможніку прадстаўлены не толькі рэпрадуктыўныя, але *пошукавыя, часткова-пошукавыя і творчыя заданні*, якія актывізуюць разумовую дзейнасць вучняў, падахвочваюць да разважанняў, новых спосабаў дзейнасці. Напрыклад, прапануецца паўдзельнічаць у стварэнні рэкламнага буклета, узнавіць кулінарны рэцэпт і г. д. Змест некаторых практыкаванняў накіраваны на фарміраванне *асобасных кампетэнцый*: этычных каштоўнасцей, адэкватнай самаацэнкі і інш.

Таксама ў вучэбным дапаможніку «Беларуская мова» рэалізуецца ***праблемны падыход*** да вывучэння моўных з'яў і маўленчага развіцця вучняў. Найперш, на ўроках вывучэння новага матэрыялу выкарыстоўваецца праблемная сітуацыя, якая завяршаецца праблемным пытаннем (пра што гаварылася вышэй).

Акрамя сітуацый па ўвядзенні новага матэрыялу праблемны падыход рэалізуецца праз змест практыкаванняў, у якіх даюцца заданні, накіраваныя на развіццё назіральнасці, уважлівасці, творчасці, актыўнага крытычнага мыслення. Напрыклад:

**50.** Прачытайце і дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

Зубр, заяц, казуля, ... — гэта назвы ... .

Бузíна, калíна, язмíн*, ... — гэта назвы ... .

Рамонак, гладыёлус, наготкі, ... — гэта назвы ... .

Ястраб, дзяцел, стрыж, ... — гэта назвы ... .



Знайдзіце і запішыце словы, у якіх адна літара абазначае два гукі. Падкрэсліце гэтыя літары.

Прымяненне праблемных сітуацый спрыяе канцэнтрацыі ўвагі вучняў, павышае іх зацікаўленасць і стварае станоўчы эмацыянальны фон для ажыццяўлення вучэбнай дзейнасці.

У вучэбным дапаможніку рэалізуюцца палажэнні ***камунікатыўна-дзейнаснага падыходу.*** Аўтары лічаць, што маўленчы вопыт найлепш фарміруецца ва ўмовах нефармальных маўленчых зносін, калі вучань з'яўляецца суб'ектам уздзеяння, а маўленчая дзейнасць становіцца сродкам вырашэння вучэбнай задачы. У дапаможніку прадугледжана праца над культурай маўлення: падабраны разнастайны дыдактычны матэрыял, у тым ліку і скорагаворкі, уключаны спецыяльныя заданні, асаблівая ўвага звяртаецца на адпрацоўку вымаўлення адметных гукаў беларускай мовы [ч], [дз'], [ц'] і інш.

Заданні па развіцці маўлення вучняў, прапанаваныя ў дапаможніку, арганічна звязаны са зместам і тэмай практыкаванняў, якія прысвечаны вывучэнню моўных з'яў. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы «Мяккі знак — паказчык мяккасці зычнага гука» вучням прапануецца дапоўніць сказы патрэбнымі словамі з апорай на малюнкі і расказаць, як маглі развівацца падзеі далей. Многія практыкаванні насычаны заданнямі, накіраванымі на ўдакладненне, узбагачэнне і актывізацыю слоўнікавага запасу навучэнцаў, утрымліваюць матэрыял для мадэлявання выказванняў на аснове апорных слоў і словазлучэнняў. Напрыклад, у практыкаванні па тэме «Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі» вучням трэба знайсці назву кожнага прадмета і расказаць, для чаго патрэбны гэтыя рэчы.




Змест практыкаванняў арыентуе таксама на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў безэквівалентнай лексікай (апоўдні, бра´ткі, бярозавік, вырай, зацірка і інш.). Прапануецца праца з дэфармаванымі сказамі і тэкстамі. Напрыклад, вучням неабходна размясціць часткі тэксту ў патрэбнай паслядоўнасці:

**Антонаўкі**

**На яблынях трымаліся апошнія *(а, д, ы, п, л).* Толькі на антонаўцы не было прымет восені.**

**Антонаўкі захоўваюцца вельмі *(ў, г, а, д, о).* Цаніць смак гэтых яблыкаў пачынаеш *(ж, й, о, з, і).***

**Наступіла *(н, о, в, ь, е, с).* Пачало ападаць пажоўклае лісце.**

Асобная ўвага ў змесце і структуры вучэбнага дапаможніка нададзена навучанню другакласнікаў пераказу. Сістэмна падаюцца практыкаванні, у якіх патрабуецца дзяліць тэкст на часткі, фармуляваць пытанні па змесце ці адказваць на іх, у тым ліку пісьмова. Для паступовай падрыхтоўкі вучняў да пераказу ў практыкаваннях даюцца заданні вусна пераказаць тэкст ці частку тэксту пасля адпаведнай метадычнай работы.

Магчымасць сістэмнай работы па развіцці маўлення вучняў дае рэалізаваны ў вучэбным дапаможніку ***тэкстацэнтрычны падыход.*** У змесце кожных заняткаў падаецца практыкаванне, на матэрыяле якога, акрамя задання па моўнай тэме, прысутнічаюць заданні, накіраваныя на рознабаковы аналіз і працу з тэкстам, стварэнне ўласнага выказвання па ўзоры ці з дапамогай апор рознага віду. У аснове гэтай працы ляжыць прынцып узаемазвязанага развіцця розных відаў маўленчай дзейнасці (аўдзіравання, чытання, гаварэння і пісьма).

Праца з прапанаванымі ў дапаможніку тэкстамі будзе спрыяць развіццю навыкаў сэнсавага чытання; уменняў працаваць з інфармацыяй; вылучаць новую (невядомую) інфармацыю ў тэксце, ажыццяўляць пошук у тэксце відавочнай і невідавочнай інфармацыі, апрацоўваць яе; выражаць уласныя адносіны да прачытанага; аргументаваць свой пункт гледжання; задаваць пытанні.

Для фарміравання *лінгвакультуралагічнай* і *сацыякультурнай кампетэнцый* прадугледжана засваенне правіл маўленчага этыкету, авалоданне сацыяльнымі нормамі маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін, фарміраванне ўважлівага стаўлення да беларускага слова. У тэкстах падаецца інфар-

мацыя пра беларускія сімвалы (зубр, лён, бульба). Падабраны і састаўлены цікавыя тэксты пра беларускія народныя святы (Дажынкі, Каляды, Масленіца, Гуканне вясны), Нацыянальную бібліятэку Беларусі, першы лялечны тэатр на Беларусі — батлейку, беларускія ручнікі, розныя куткі Беларусі (вёска Ляўкі, возера Нарач), пра рэчы, якімі карысталіся людзі раней (збан, куфар) і інш. Вучні даведаюцца пра паходжанне беларускіх назваў месяцаў — верасень, кастрычнік, лістапад, сакавік.

Варта адзначыць выхаваўчую скіраванасць падабранага дыдактычнага матэрыялу. У тэкстах практыкаванняў уздымаюцца тэмы павагі і любові да Радзімы, роднай мовы; памяці пра герояў Вялікай Айчыннай вайны; клапатлівых і паважлівых адносін да мамы, узаемаадносін у сям'і; дапамогі дарослым; сяброўства; адносін да працы; беражлівых адносін да прыроды і г. д. Абмеркаванне празаічных і вершаваных твораў будзе садзейнічаць выхаванню эстэтычных пачуццяў вучняў. У дапаможніку прапануюцца і невялікія жарты, смяшынкі, разнастайныя займальныя заданні (загадкі, рэбусы), пошук назвы ў акравершы і інш.

Міжпрадметныя сувязі ў вучэбным дапаможніку рэалізуюцца праз змест практыкаванняў. Вучні атрымліваюць звесткі пра раслінны і жывёльны свет Беларусі: сезонныя змены ў прыродзе і жыцці вавёркі, вожыка, мядзведзя, пра расліны поля і лугу, насельнікаў вадаёмаў, даведваюцца, як пасадзіць дрэва і інш. Пашырэнню кругагляду навучэнцаў паспрыяюць звесткі з практыкаванняў пра лятучых рыб, самую маленькую птушку Беларусі, славутую пушчу Беларусі, пра снег, дроны і беларускія народныя святы (сувязь з вучэбным прадметам «Чалавек і свет»).

У практыкаваннях актуалізуюцца веды вучняў пра структурныя часткі кнігі, карыстанне бібліятэкай, цікавыя звесткі пра Нацыянальную бібліятэку Беларусі. Да тэкстаў даюцца пытанні на разуменне іх фактычнага зместу, пошук інфармацыі, пададзенай у невідавочным выглядзе, пытанні на фарміраванне ўмення інтэрпрэтаваць інфармацыю тэксту і рабіць высновы. Пытанні да практыкаванняў на аснове мастацкіх твораў накіраваны на фарміраванне чытацкіх уменняў вучняў, што рэалізуе сувязь з вучэбным прадметам «Літаратурнае чытанне».

Міжпрадметная сувязь з вучэбным прадметам «Руская мова» рэалізавана ў кірунку папярэджання магчымага інтэрферэнцыйнага ўзаемадзеяння блізкароднасных моў. З гэтай мэтай падаюцца звесткі па дыферэнцыяцыі акцэнталагічных норм у словах рускай і беларускай моў (напрыклад, крапи´ва — крапіва´, спина´ — спі´на), адрозненні ў граматычных формах «с папой» (рус.) — «з татам» (бел.) і інш.).

У дапаможніку можна прасачыць і міжпрадметныя сувязі з вучэбным прадметам «Працоўнае навучанне». Вучні даведваюцца пра такі від мастацтва, як выбіванка; з чаго раней рабілі калыскі; што вышывалі на ручніках і г. д.

Такім чынам, прадстаўленая ў вучэбным дапаможніку інфармацыя будзе спрыяць пашырэнню агульнага кругагляду вучняў, іх усебаковаму развіццю, дасведчанасці ў розных сферах жыцця.

У вучэбным дапаможніку «Беларуская мова» рэалізаваны зместавыя лініі навучання, прадугледжаныя вучэбнай праграмай. Моўны і маўленчы матэрыял падабраны і аформлены так, каб спрыяць зацікаўленасці вучняў да вывучэння беларускай мовы. Ён ахоплівае розныя сферы дзіцячых інтарэсаў. Заданні да практыкаванняў забяспечваюць паступовае фарміраванне ўменняў, навыкаў і спосабаў дзейнасці і па сваёй форме распрацаваны такім чынам, каб матываваць вучняў да іх выканання. Увесь матэрыял вучэбнага дапаможніка, акрамя дасягнення вучнямі прадметных вынікаў, накіраваны на стварэнне спрыяльнай, добразычлівай атмасферы пры вывучэнні беларускай мовы, выхаванне пачуццяў патрыятызму, духоўнасці, адказнасці, працавітасці, гонару за сваю Радзіму.

*Матэрыял паступіў у рэдакцыю 01.08.2022.*